«ЗАЦВЯРДЖАЮ»
Намеснік старшыні
Наваполацкага гарвыканкама
А.У.Адзіночкін
«  »____2022 г.

**Палажэнне**

Аб правядзенні гарадскога літаратурнага Конкурсу «Родныя вобразы», прысвечанага 140-годдзю з дня нараджэння Народнага паэта Беларусі Якуба Коласа.

1.Агульныя палажэнні

1.1.Палажэнне распрацавана ў мэтах арганізацыі і правядзення конкурсу школьных сачыненняў на тэмы фальклору, гісторыі, псіхалогіі беларускага народа і да дня нараджэння Народнага паэта Беларусі Якуба Коласа (далей - Конкурс).

1.2.Мэтай Конкурсу з’яўляецца выхаванне патрыятызму, садзейнічанне павышэнню творчых рыс навучэнцаў, папулярызацыя культуры Беларусі.

1.3.Мэты і задачы Конкурсу:

выяўленне і развіццё творчых здольнасцей навучэнцаў;

падахвочванне да вывучэння гісторыі і культуры Беларусі;

фарміраванне сярод падрастаючага пакалення нацыянальнай самаідэнтыфікацыі, пачуцця гонару ў вучняў за сваю Радзіму.

2.Арганізатары Конкурсу

2.1.Наваполацкі гарадскі выканаўчы камітэт.

2.2.Аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справам моладзі Наваполацкага выканаўчага камітэта.

2.3.Аддзел па адукацыі Наваполацкага гарадскога выканаўчага камітэта.

2.4.Установа культуры «Музей гісторыі і культуры г.Наваполацка».

2.5.Рэдакцыя гарадской газеты «Новополоцк сегодня».

2.6.Наваполацкая гарадская арганізацыя грамадскага аб’яднання «Беларускі фонд міру».

2.7.Наваполацкая гарадская арганізацыя грамадскага аб’яднання «Беларускі саюз жанчын».

3.Удзельнікі Конкурсу

К удзелу ў Конкурсе запрашаюцца навучэнцы 10 - 11 класаў сярэдніх агульнаадукацыйных навучальных устаноў горада, а таксама навучэнцы 1-2 курсаў сярэдне-спецыяльных устаноў адукацыі.

4. Умовы і парадак правядзення конкурсу

Конкурс праводзіцца ў перыяд з 1 верасня 2022 года па 30 кастрычніка 2022 года (уключна).

Конкурс праводзіцца ў два этапы:

1 этап: на ўзроўні ўстановы адукацыі.

Парадак правядзення і адбор работ, якія прэтэндуюць на прызавыя месцы на першым этапе вызначаюцца ў рамках устаноў адукацыі. Прызнаныя лепшымі работы (па 1-м твору ад установы адукацыі), накіроўваюцца на адрас Конкурсу ў УК «Музей гісторыі і культуры г.Наваполацка» (г.Наваполацк, вул.Маладзёжная, 45/3) да 10 кастрычніка 2022 года (уключна) з паметкай «Конкурс». Кожная навучальная ўстанова, якая прыняла ўдзел у Конкурсе, павінна прадставіць даведку аб агульнай колькасці ўдзельнікаў Конкурсу і аб колькасці работ, адпраўленых на Конкурс, завераную подпісам дырэктара і пячаткай установы адукацыі. Даведка з'яўляецца абавязковым атрыбутам Конкурсу.

2 этап: на ўзроўні арганізатараў Конкурсу.

Арганізатарамі Конкурсу ажыццяўляецца адбор лепшых работ, дасланых на Конкурс у адпаведнасці з крытэрамі ацэнкі твораў (п. 6 гэтага Палажэння) для прысуджэння ім у далейшым прызавых месцаў.

Для правядзення Конкурсу ствараецца Конкурсная камісія, якая будзе ацэньваць Конкурсныя работы. Работа Конкурснай камісіі па ацэнцы твораў арганізуецца з 10 кастрычніка па 20 кастрычніка 2022 года.

Для напісання Конкурсных работ удзельнікам прапануюцца наступныя тэмы:

1) «Вобразы роднага краю»;

2) «Побыт беларусаў XIX – першая палова XX стагоддзяў»;

3) «Беларускі народ падчас Першай сусветнай вайны / Вялікай Айчыннай вайны»;

4) «Думкі пра ўз’яднанне Заходняй і Усходняй Беларусі»;

5) «Жыццёвы шлях беларускай мовы»;

Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджанне пераможцаў адбудзецца ў перыяд з 20 кастрычніка па 30 кастрычніка 2022 года.

Узнагароджанне пераможцаў праводзіцца ва ўрачыстай абстаноўцы.

Аўтары твораў, якія занялі:

- I месца - ўзнагароджваюцца Дыпломам і каштоўным падарункам, якія прадстаўляюцца арганізатарамі Конкурсу;

- II і III месцы - Граматамі, а таксама падарункамі (па меркаванні арганізатараў Конкурсу).

Набыццё прызоў, грамат ажыццяўляецца за кошт сродкаў арганізатараў Конкурсу.

Арганізатары пакідаюць за сабой права прысуджэння дадатковых узнагарод і прызоў.

5. Патрабаванні да афармлення конкурсных работ.

Сачыненне павінна быць прадстаўлена на Конкурс у электронным выглядзе, аб'ём не павінен перавышаць 2-х лістоў фармату А4, праз 1,5 інтэрвалу, 15-м шрыфтам Times New Roman.

Дасланыя на Конкурс работы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца, а таксама могуць выкарыстоўвацца ў далейшым па меркаванні арганізатараў.

6. Крытэрыі ацэнкі конкурсных работ:

адпаведнасць работы тэме Конкурсу;

паўната раскрыцця тэмы, змястоўнасць;

мастацкі густ і выразнасць; паслядоўнасць і арыгінальнасць выкладу;

вітаецца наяўнасць ілюстрацыйнага матэрыялу: фатаздымкаў - архіўных або сучасных; малюнкаў, якія адлюстроўваюць тэму;

патрыятычная накіраванасць і выхаваўчы эфект;

арыгінальнасць жанру, індывідуальны стыль аўтара;

адлюстраванне асабістага стаўлення да тэмы, уменне аўтара шчыра перадаць свае эмоцыі;

адсутнасць стылістычных, граматычных, маўленчых, арфаграфічных і пунктуацыйных памылак (захаванне нормаў літаратурнай мовы);

багаты слоўнікавы запас, уменне будаваць складаныя сінтаксічныя і граматычныя канструкцыі, не перагружаючы пры гэтым тэкст непатрэбнай інфармацыяй;

афармленне работы (тытульны ліст);

Работа можа быць напісана толькі на беларускай мове.

7.Конкурсная камісія.

Конкурсная камісія па правядзенні Конкурсу і ацэнцы твораў

складаецца з кіраўнікоў метадычных аб'яднанняў настаўнікаў беларускай мовы аддзела па адукацыі Наваполацкага гарвыканкама, кіраўніка метадычнага аб'яднання настаўнікаў гісторыі і грамадазнаўства аддзела па адукацыі Наваполацкага гарвыканкама і прадстаўнікоў арганізатараў Конкурсу.

ДАДАТАК

**УСТАНОВА АДУКАЦЫІ**

**«Назва ўстановы адукацыі»**

211440,
Віцебская вобл.,
г.Наваполацк,
Вул. … , д. …
Тэл./факс: …

Конкурсная работа «НАЗВА  РАБОТЫ»

Аўтар:Імя, імя па бацьку, прозвішча
клас/група
дата нараджэння
Тэл.:
Кіраўнік:Імя, імя па бацьку, прозвішча
Пасада
Тэл.:

Наваполацк 2022